Нацыянальны інстытут адукацыі

Кампетэнтнасны падыход

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. М. Якуба

# Беларуская мова

# 11 клас

## Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы

(базавы і павышаны ўзроўні)

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мазыр
«Выснова»
2021

# Базавы ўзровень

## АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ. СТЫЛІСТЫКА

**1** **Прачытайце тэксты. Вызначце стыль маўлення, абгрунтуйце свой адказ.**

**I.** Мова і маўленне — паняцці ўзаемазвязаныя ў тым сэнсе, што мова як сістэма знакаў выяўляецца ў працэсе маўленчай дзейнасці. Адсюль зразумела, што маўленне — гэта арганізаваны па законах мовы працэс выкарыстання моўных адзінак з мэтаю выражэння пэўнага зместу. Інакш кажучы, гэта — разнастайныя акты рэалізацыі камунікатыўных патрэб чалавека, асобных груп, калектываў, грамадства пры дапамозе слоў як знакаў моўнай сістэмы...

Сёння ўжо фактычна няма сумнення ў тым, што менавіта маўленне маецца на ўвазе, калі мы гаворым пра такія камунікатыўныя якасці, як дакладнасць, лагічнасць і інш. Мова як знакавы механізм зносін не можа быць сама па сабе ні дакладнай, ні лагічнай, ні выразнай. **Яна з'яўляецца скарбніцай, у якой вякамі назапашваліся сродкі, з дапамогай чаго наша думка, выказаная вусна ці пісьмова, становіцца дакладнай, лагічнай, выразнай** *(Т. І. Тамашэвіч).*

**II.** Адчуваеш розніцу?

Азірніся і паслухай: кожны чалавек мае адметнасці маўлення, так жа? Адзін спяшаецца і глытае канчаткі, другі ўжывае слоўцы-паразіты кшталту «ну», «гэта», «карацей», трэці павольны, нешматслоўны, цэдзіць з сябе сказы праз зубы. Гэта адна адметнасць. А другая — лексічнае багацце.

Вось вясковая бабулька. У яе мове шмат слоўцаў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі — «унучачка», «рэчанька», «лясочак», «ночачка», «дзянёчак». Мясцовая гутарка поўніцца дыялектызмамі, у ёй шмат афарызмаў.

А вось, скажам, вучоны дзядзька. Дык у яго і ў звычайнай размове будуць сустракацца спецыфічныя слоўцы, маўленне будзе дакладным, лагічным. Напрыклад, спытаем у той бабулькі і таго дзядзькі пра надвор'е: якім яно будзе ў наступную нядзельку? Бабулька скажа:

— Хто ж тое ведае? Як Бог дасць, унучачак, так і будзе. Будзе дожджык — зямельку напоіць, будзе сонца — градку праполем...

А дзядзька, мабыць, нахмурыць бровы:

— Дакладнасць прагноз.. змян(?)шаецца ў г..аметрычнай прагрэсіі ў залежнасці ад д..ўгатэрміновасці. Шэсць дзён — в..лікі тэрмін нават для дз..сяціпрацэнтнай верагоднасці... Адчуваеш розніцу? *(В. Шніп).*

1. Якая думка прасочваецца ў абодвух тэкстах? Як звязаны мова і маўленне і чым яны адрозніваюцца? Якія якасці маўлення вы ведаеце?
2. Вызначце стыль маўлення двух тэкстаў. Дакажыце сваю думку, карыстаючыся асноўнымі прыметамі стыляў маўлення.
3. Якімі стылеўтваральнымі сродкамі карыстаецца аўтар другога тэксту, каб паказаць маўленне дзядзькі і бабулькі?
4. Ці можна сцвярджаць, што выказванне дзядзькі адносіцца да гутарковага маўлення? Ці адпавядаюць выбраныя ім моўныя сродкі сітуацыі маўлення? Абгрунтуйце сваю думку.
5. Запішыце апошні абзац другога тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары.
6. Прывядзіце прыклады моўных адзінак (фразеалагізмаў, прыказак, устойлівых параўнанняў і інш.), якія б характарызавалі маўленне чалавека.

7. Запішыце выдзелены сказ. Падкрэсліце граматычныя асновы, вызначце спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Выпішыце са сказа словазлучэнні, складзіце іх схемы.
8. Растлумачце напісанне прапушчаных літар у словах у другім тэксце.

**2** **Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку, стыль і тып.**

**Сон**

Мне сні..ся сон мяне (не, ня)разумелі.
Я гаварыў а словы (ні)бы гра(д, т)
Па тварах і вач.. людзей зв..нелі
І да мяне вярталіся наза(д, т).

Я гаварыў адрына вёска дзіва.
Я гаварыў кахан..е слодыч спеў.
А голас мой ахрыплы страшны дзікі
(Ні, не)хто (не, ня)чуў (ні, не)хто (не, ня)разумеў.

Муры′ маўчалі грозна і сурова,
І ў роспачнасці гэтай нематы
Падумаў я: калі не трэба мовы,
Каму патрэбны гэты свет і ты?

І я да нейкай бездані памкнуўся
І ўбачыў цемру і свой блізкі скон.
Апошні крок... Ды раптам я прачнуўся.
Такі вось сон. Такі трывожны сон...

*Н. Гальпяровіч.*

1. Што для аўтара з’яўляецца страшным, трывожным сном?
2. Якія стылеўтваральныя сродкі выкарыстоўвае аўтар для рэалізацыі тэмы і асноўнай думкі твора?
3. Чым адрозніваецца мова ад маўлення? У якіх формах можа існаваць маўленне?
4. Растлумачце значэнне слова *адрына* шляхам падбору сіноніма.

5. Спішыце першыя дзве страфы верша, ракрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Абгрунтуйце свой выбар.

**3** **Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і жанр маўлення. Назавіце характэрныя прыметы гэтага стылю. Пацвердзіце свой адказ прыкладамі з тэксту.**

Слова «квэст» ужо амаль ні ў кога не выклікае пытанняў «Што гэта?» і «Навошта гэта?». Удзел у квэсце падобны да перамяшчэння ў іншую рэальнасць, а хтосьці яе стварае, што не менш цікава.

Мы паразмаўлялі з хлопцамі-падлеткамі Аляксандрам Васілевічам і Уладзімірам Германам, якія робяць квэсты для кампаній. Вось некаторыя вытрымкі з нашай размовы.

**Саша**: Мы абодва вучыліся па праграме «Крэатыўны лідар» у школе бізнесу для падлеткаў. Працавалі з рознымі брэндамі, і задача была ў тым, каб палепшыць іх пазнавальнасць.

**Вова**: Мы заўсёды пачынаем з разведкі: едзем у гандлёвы цэнтр, глядзім, якія там ёсць крамы. Потым раімся з нашым галоўным менеджарам у Школе і пачынаем прыдумляць пытанні. На гэта сыходзіць прыкладна месяц. У кожнага ў выніку атрымліваецца па 15—20 пытанняў. Потым зноў раімся і адбіраем дзесяць найлепшых пытанняў. Даводзім іх да ладу: нешта папраўляем, падбіраем карцінкі, афармляем пад стылістыку новага квэста. Калі пытанні гатовы, пачынаецца актыўны піяр квэста ў сацсетках. Хто хутчэй адказвае на ўсе пытанні, атрымлівае прыз. Гэта не так, як у квэст-румах, дзе ты збіраеш элементы.

**Саша**: Асаблівасць у тым, што пытанні павінны быць звязаныя з назвамі крам. Нават калі назвы вельмі незвычайныя, ты ўсё роўна павінен прыдумаць да іх пытанне. Мне падабаецца складаць пытанні, таму ў мяне ўсё адразу сыходзіцца.

**Вова**: Калі ты бярэш назву крамы, ты ў першую чаргу думаеш, якія ў цябе яна выклікае асацыяцыі. А потым даводзіш іх да ладу, каб зразумела было не толькі табе па тваіх асацыяцыях, але каб іншыя людзі маглі нешта

зразумець, разгадаць. Асацыяцыі, рыфмы, словы, карцінкі, сінонімы, антонімы — вось гэта ўсё.

Перш за ўсё — гэта новыя веды і досвед. Такога досведу ты нідзе не атрымаеш. А грошы — гэта прыемная падзяка за твае намаганні.

**Саша:** Калі я толькі ўступаў у гэты праект, наогул не думаў пра грошы. Матывацыя была ў тым, каб у прынцыпе ў чымсьці паўдзельнічаць. Я з самага пачатку хацеў чым-небудзь займацца. Мяне наогул не прыцягвала проста існаванне. Ёсць нешта, што цябе запальвае знутры, табе гэта вельмі падабаецца. У мяне такая рэч — гэта праект.

Яшчэ быў вялікі досвед працы ў камандзе. На самай справе працаваць у камандзе вельмі складана, таму што 50 % рэсурсаў ідзе на тое, каб проста арганізаваць людзей.

**Вова:** *Працаваць у камандз.. па-першае гэта вядома а..казнасць. Па-другое сабранасць. Па-трэцяе гэта ўменне камунікаваць з людз..мі. Уменне прадаваць. Гэта значыць ты павінен рэкламадаўц.. у якога хоч..ш размясціць свой пост «прадаць» пра..кт не падобны да іншых. Але на сам..й справе безумоўна не прадаць а пер..канаць рэкламадаўц.. б..сплатна ра..мясціць інфармацыю пра твой квэст.*

**Вова:** Калі хто хоча рэалізаваць такі праект у сябе ў горадзе, трэба пагрузіцца ў гэтыя веды. Трэба паглядзець, як гэта ўсё выглядае збоку, паваланцёрыць, каб усвядоміць усю механіку.

**Саша:** І можна напісаць нам. Мы б што-небудзь прыдумалі *(Паводле А. Правальскай).*

1. Ці патрэбна хлопцам ведаць мову, каб рэалізаваць свой праект? Якія формы маўлення яны выкарыстоўваюць падчас сваёй працы?
2. Назавіце запазычаныя словы, што сустракаюцца ў тэксце, растлумачце іх значэнні.
3. Выпішыце з тэксту фразеалагізм, падбярыце да яго сінонімы.
4. Спішыце выдзеленую курсівам рэпліку Вовы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце свой выбар.

5. У запісаным тэксце падкрэсліце спецыфічныя беларускія словазлучэнні, вызначце тып сувязі паміж кампанентамі. Знайдзіце ў тэксце іншыя словазлучэнні, што вызначаюцца адметнасцю кіравання ў беларускай мове.
6. Парайце хлопцам слоўнікі, якімі яны могуць карыстацца пры падрыхтоўцы пытанняў да квэстаў.
7. Складзіце квэст для беларускага брэнда.

**4** | **Прачытайце. Вызначце стыль і жанр тэксту, абгрунтуйце сваю думку.**

А. В. Пятровічу
Магілёў, Беларусь.
Факс: (0222) 58-42-57

Паважаны Аляксандр Васільевіч!

Запрашаем Вас прыняць удзел ва ўрачыстым адкрыцці свята «Пароль неўміручасці — роднае слова», прымеркаванага да Міжнароднага дня роднай мовы. Адкрыццё свята адбудзецца 21 лютага 2022 г. а 14 гадзіне па адрасе г. Мінск, вул. Напалеона Орды, 22, ДУА «Сярэдняя школа № 25 г. Мінска», актавая зала.

Просім загадзя паведаміць пра Ваш удзел у мерапрыемстве, тэму Вашага выступлення і нумар тэлефона, па якім мы зможам з Вамі звязацца.

З павагай, ад імя аргкамітэта Алена Петрушэнка.
12 снежня 2021 года.
тэл. 8-017-277-13-28

1. Калі ў свеце пачалі адзначаць Міжнародны дзень роднай мовы? Якія падзеі паслужылі перадумовай для гэтага?
2. Каму адрасаваны тэкст? Вызначце яго мэтанакіраванасць.
3. На якія структурныя часткі падзяляецца тэкст? Ахарактарызуйце іх.
4. Якія сінтаксічныя канструкцыі ўжываюцца ў тэксце?
5. Напішыце адказ ад імя адрасата. У якім стылі будзе аформлена ваша выказванне?

# СІНТАКСІЧНЫЯ І ПУНКТУАЦЫЙНЫЯ НОРМЫ

## Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў

**5** **Прачытайце тэкст. Дакажыце, што ён адносіцца да тыпу разважання. Абгрунтуйце выбар загалоўка.**

**Можа — праб'ецца**

У л..сным зацішк.. у цен.. між сосен уразіў кволы парастак. Чатыры адмыслова выразаны.. пляскаты.. лісты падобныя да прапел..ра. Сц..блінка тонкая кволая танчэйшая за жытн..ю — аж дзівішся з яе. Як яна трымае такія шырокія лісты!

З захапленнем падумалася што з такіх парасткаў вырастаюць волаты(дубы) забыцца на якія (не)магчыма. З такога парастк.. пачынаецца цар лес..! Пройдзе час і ўздым..цца ўзн..сецца над з..млёй над дрэвамі магутна ра..кіне вузлаватае нібы ўсё ў мускулах гал..ё...

За захапленнем прыйшоў абачлівы одум. Не мусіць на гэты раз цуд.. (не, ня)будзе. Напэўна (не, ня)будзе з гэтага парастк.. волата(дуба). Вельмі ж моцна ўраслі ў з..млю спл..ліся карэн..ем гал..ём сосны. Дружныя дужыя яны акружылі з усіх бакоў захапілі з..млю засланілі неба. Праз іх парастак не зможа ра..расціся (не)пусцяць...

(Не)хочацца верыць у такое. А можа ўсё зменіцца на лепшае? А можа — праб'ецца узн..сецца? Усё ж ён (не)проста парастак ён — зерне волата *(Паводле І. Мележа).*

1. Што сімвалізуе кволы парастак у тэксце? Чаму аўтар называе парастак *зернем волата*? Як вы думаеце, ці праб'ецца парастак?
2. Вызначце сродкі сувязі сказаў у трэцім абзацы тэксту.
3. Растлумачце значэнне слова *одум*. Да якой лексікі яно адносіцца:

1) размоўнай;
2) агульнаўжывальнай;
3) кніжнай?

4. Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. У сказах першага абзаца падкрэсліце дзейнікі і выказнікі. Вызначце, чым яны выражаны.
5. Выпішыце з тэксту словазлучэнні, што ілюструюць спецыфіку дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Зрабіце іх графічны разбор.
6. Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, пазнаёмцеся з кнігай Я. Брыля «Парастак». Раскажыце пра запісы і эсэ, аб'яднаныя пад адной назвай.

**6** **Запішыце верш, раскрываючы дужкі і захоўваючы правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў, і правілы дапасавання ў словазлучэннях. Вызначце, з якой мэтай напісаны тэкст.**

...А я раздабыў Сусвет,
пачуўшы шчаслівы крык
маленькай маёй дачкі,
калі (асвятліць) два сонцы, —
*(зялёны) дзве планеткі*, —
калі крануўся далонек,
дзе грэлася мая будучыня,
і цалаваў у вуські,
дзе прарастала слова
жывучай матчынай мовы.

*Г. Пашкоў.*

1. Як вы разумееце выраз *А я раздабыў Сусвет*...? Якія метафары выкарыстоўвае аўтар?
2. З якім паводле структуры сказам запісаны тэкст суадносіцца? У кожнай частцы складанага сказа падкрэсліце галоўныя члены сказа. Вызначце, чым яны выражаны.

3. Растлумачце значэнне слова *вуські*. Раскрыйце сэнс фразеалагізмаў *з вуснаў у вусны, чуць з трэціх вуснаў*, выкарыстайце іх у самастойна складзеных сказах. Разбярыце складзеныя вамі сказы па членах сказа.

## Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку

**7** | **Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.**

**Уладзіміру Караткевічу**

Ён выпорвае слоўца
з імхоў забыцця
(Не заўважыць другі
і нагой наступіўшы!).
***Ім крамяным***
***любуецца круціць пя..чотна***
***А пасля ачы..чае ад жухлай іглiцы***
***Ад прыліплых пя..чынак***
***малых парушынак***
***І ў ёмісты кош свой кладзе.***
У тым кашы
З-пад Бягомеля слоўцы,
з-пад Воршы і Пінска...
Аднаго зразумець не магу:
Як жа ён
Наадшукваў іх гэтулькі,
гледзячы ў неба!

*Г. Каржанеўская.*

1. У якіх радках заключаецца асноўная думка тэксту? Якія вобразы выкарыстоўвае аўтар? Што яго здзіўляе?
2. Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа, растлумачце іх сэнсава-стылістычную ролю.
3. У якім значэнні слова *ёмісты* ўжываецца ў тэксце:
   1) ‘здольны змясціць у сабе вялікую колькасць каго-небудзь, чаго-небудзь’;

2) ‘з багатым зместам, з вялікім унутраным сэнсам’;
3) ‘якім добра і лёгка карыстацца; зручны’?

4. Выпішыце з тэксту выдзелены сказ, каменціруючы напісанне прапушчаных літар і расстаноўку знакаў прыпынку.
5. Знайдзіце ў тэксце дзеепрыслоўі, дайце ім марфалагічную характарыстыку. Растлумачце неабходнасць адасаблення/неадасаблення.
6. Карыстаючыся рознымі крыніцамі, прывядзіце прыклады ўстарэлых слоў, якія У. Караткевіч выкарыстоўвае ў аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха».

**8** **Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай тэксту.**

Пра Язэпа Драздовіча так званыя шырокія грамадскія колы або не ведаюць зусім, або чулі нешта прыблізнае: быў такі вандроўны мастак, маляваў дываны. Так, апошнія гады свайго жыцця ён хадзіў ад вёскі да вёскі па роднай Дзісеншчыне і зарабляў капейку на хлеб і фарбы маляваннем насценных дываноў.

А была ж і першая палова жыцця. У гэты час у жыцці Я. Драздовіча было многа падзей і навучанне ў мастацкай школе і служба ў царскай арміі і выкладчы..кая праца ў Навагру..ку і ўдзел у культурным жыц..і Вільні і знаёмства з выдатнымі людз..мі свайго часу С. Рак-Міхайлоўскім Л. Радзевічам І. Канчэўскім М. Гарэцкім У. Жылкам Р. Шырмам. Была спроба замацавацца і ў п..слярэвалюцыйным Мінск.. дзе мастак займа..ся кніжнай графікай. Ды чамус..ці ні ў Мінск.. ні ў Вільн.. ён не прыжыўся. Як быццам неадольная сіла вяла яго далей ад гарадоў. З цягам часу мастакі наступнікі і духоўныя на..чадкі выратавалі гэту неардынарную асобу ад поўнага забыцця.

Што асоба сапраўды непаўторная, сёння зразумела кожнаму. Графік, жывапісец, *рэзчык* па дрэве, ён, акрамя ўсяго, раскопваў старажытныя гарадзішчы і замалёўваў за́мкі, пісаў мастацкія творы і запісваў фальклор, адкрыў школку на роднай мове, арганізаваў аматарскі тэатр, захапляўся *касмалогіяй* і чытаў сялянам лекцыі па

астраноміі. Нельга не згадаць пра яго *фенаменальную* здольнасць падарожнічаць у снах на *невядомыя* планеты, а пасля расказваць пра нянаскія планеты. Дарэчы, апісанне гэтых сноў (іх называюць прывідамі і летуценнямі, а сам мастак лічыў іх астральнымі падарожжамі) займае значнае месца на старонках найцікавейшага дзённіка. Іх графічнае і жывапіснае ўвасабленне зрабіла Я. Драздовіча пачынальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве.

***Цэлыя серыі карцін прысвяціў ён гістарычным асобам — Францыску Скарыне і Усяславу Чарадзею, полацкім і смаленскім князям.*** Я. Драздовіч мог бы стаць заснавальнікам цэлай мастацкай школы, каб не такой пакручастай была яго жыццёвая сцяжына. На жаль, пад канец жыцця ўсе яго сувязі з Вільняй і старымі сябрамі парваліся.

***Мастакі, крытыкі, вучоныя — усе сённяшнія знаўцы мастацтва лічаць яго нерэалізаваным геніем.*** А землякі — хто ведаў яго, размаўляў з ім ці чуў ад старэйшых — памінаюць добрым словам *(Паводле Г. Каржанеўскай).*

1. Чаму многія людзі лічылі Я. Драздовіча летуценнікам? Хто з беларускіх мастакоў з'яўляецца прадаўжальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве? Што вы ведаеце пра тэхніку малявання насценных дываноў?
2. Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Пракаменціруйце пунктуацыйнае афармленне сказаў з аднароднымі членамі і прыдаткамі. Прывядзіце іншыя прыклады сказаў з тэксту.
3. Растлумачце напісанне арфаграм у выдзеленых словах.
4. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленых сказаў.
5. З лексікаграфічных крыніц выпішыце прыказкі на тэму «Творчасць, мастацтва», якія суадносяцца са сказамі, пабудаванымі па наступных схемах:
   1) і ○; і ○.
   2) ⊙: і ○, і ○.
   3) ○, *ды* ○.

# Змест

**ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Базавы ўзровень**

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ. СТЫЛІСТЫКА . . . . . . . . . . 6
СІНТАКСІЧНЫЯ І ПУНКТУАЦЫЙНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . 12
Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў . . . 12
Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Правілы пабудовы сказаў з адасобленымі членамі, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Правілы пабудовы сказаў з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Правілы пабудовы сказаў са зваროткамі, знакі прыпынку . . . 26
Правілы пабудовы сказаў з параўнальнымі зваротамі, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Правілы пабудовы складаназлучаных сказаў, знакі прыпынку 33
Правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку 35
Правілы пабудовы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Правілы пабудовы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак, знакі прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай . . . . . . . . 43

**Павышаны ўзровень**

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ. СТЫЛІСТЫКА . . . . . . . . . 46
МАЎЛЕНЧЫЯ ЗНОСІНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
ВУСНАЕ МАНАЛАГІЧНАЕ МАЎЛЕННЕ . . . . . . . . . . . . . 53
СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . 59
СЛОВАЗЛУЧЭННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
ПРОСТЫ СКАЗ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Сказ, асноўныя функцыі сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа, спосабы іх выражэння. Стылістычныя магчымасці розных форм выражэння выказніка . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Аднасастаўныя сказы, іх віды, спосабы выражэння галоўнага члена ў іх. Размежаванне няпоўных і аднасастаўных сказаў. Сэнсава-стылістычная роля аднасастаўных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення . . . . . . . . . . . . . . . . 67

Сказы з аднароднымі членамі, іх сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа . . . 69
Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя азначэнні і прыдаткі, акалічнасці, дапаўненні, удакладняльныя члены сказа, іх сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля . . . 72
Сказы са звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, іх сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля ў тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення . . . 75
Сказы з параўнальнымі зваротамі, іх сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці . . . 79
СКЛАДАНЫ СКАЗ . . . 80
Складаназлучаныя сказы, знакі прыпынку . . . 80
Складаназалежныя сказы, знакі прыпынку . . . 80
Бяззлучнікавыя складаныя сказы, знакі прыпынку . . . 84
Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, знакі прыпынку 86
Канструкцыі з чужой мовай, знакі прыпынку . . . 88

**ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** . . . 92

**Базавы ўзровень**

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ. СТЫЛІСТЫКА . . . 96
СІНТАКСІЧНЫЯ І ПУНКТУАЦЫЙНЫЯ НОРМЫ . . . 101
Нормы дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў . . . 101
Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі і адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі, знакі прыпынку . . . 103
Правілы пабудовы складаных сказаў, знакі прыпынку . . . 109
Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай . . . 111
ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА . . . 114

**Павышаны ўзровень**

АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МОВЕ. СТЫЛІСТЫКА . . . 120
МАЎЛЕНЧЫЯ ЗНОСІНЫ . . . 124
СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . 128
Словазлучэнне . . . 128
Просты сказ . . . 131
Складаны сказ . . . 137
Канструкцыі з чужой мовай . . . 142
ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА . . . 145
Спіс выкарыстанай літаратуры . . . 151